# КНІГАЗНАЎЧЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

***Вера Аляксандраўна Касап,*** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Як вядома, у 1944 г. у Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага пачалася падрыхтоўка бібліятэчных кадраў. У адпаведнасці з навучальным планам у кола дысцыплін, якія вывучаліся на працягу існавання факультэта, уваходзіла і кнігазнаўства. Выкладчыкі, аспіранты і супрацоўнікі факультэта і універсітэта ў розныя гады займаліся даследаваннем тэарэтычных, гістарычных, арганізацыйных аспектаў кнігазнаўчай навукі і практычнай дзейнасці. Стварэнне ў 1975 г. Мінскага інстытута культуры значна актывізавала навуковыя кнігазнаўчыя даследаванні. Менавіта на гэтыя гады прыпадаюць першыя абароны кандыдацкіх дысертацый, па тэматыцы звязаныя з кнігазнаўчымі праблемамі, напрыклад, Р. А. Ровінай "Развіццё тэхнічнай літаратуры ў Беларускай ССР (1919–1970 гг.)", абароненай у 1973 г.; І. У. Мельнік «Часопіс "В мире книг" як тып кнігазнаўчага выдання (1958–1972 гг.)», абароненай у 1974 г.; Я. С. Умецкай "Гісторыя кнігавыдання ў Беларусі ў першай трэці XIX стагоддзя (1801 — 1832 гг.)", абароненай у 1977 г.

Асноўная частка рознабаковых кнігазнаўчых даследаванняў ажыццяўляецца сёння супрацоўнікамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (раней – бібліятэчным), хаця ў апошнія гады да іх далучыліся спецыялісты іншых кірункаў дзейнасці – філосафы, гісторыкі, культуролагі, мастацтвазнаўцы. Паводле звестак бібліяграфічных крыніц [1; 2], ва універсітэце падрыхтавана звыш 200 навуковых работ па праблемах кнігазнаўства, сярод якіх аўтарэфераты абароненых дысертацый, манаграфіі, даведачныя выданні, шматлікія артыкулы ў перыядычных выданнях і выданнях, якія працягваюцца, дэпанаваныя рукапісы.

Далейшай актывізацыі кнігазнаўчых даследаванняў ва універсітэце паспрыяла адкрыцце з 1996 г. Савета па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абароне дысертацый па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства", а таксама ажыццяўленне падрыхтоўкі студэнтаў на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый па спецыялізацыі "Кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю". Навуковыя даследаванні ў галіне кнігазнаўства ажыццяўляе створаны ва універсітэце ў 1995 г. аддзел рэдкіх кніг (з сакавіка 2007 г. – сектар). На працягу свайго існавання супрацоўнікі арганізавалі шэраг міжнародных навуковых, навукова-практычных канферэнцый, семінараў, прысвечаных тэорыі і сучаснаму стану кнігі на Беларусі. Напрыклад, "Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць", "Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні", прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры і інш. [3].

Аналіз кірункаў праведзеных даследаванняў сведчыць, што яны звязаны з тэарэтычнымі і крыніцазнаўчымі праблемамі кнігазнаўства (звыш 30 артыкулаў); гісторыяй беларускай кнігі (звыш 110, у тым ліку: перыяду феадалізму – 25, перыяду капіталізму – каля 24, савецкаму перыяду – звыш 35, сучаснаму перыяду – 22); праблемамі культуры кнігі і мастацтвам кнігі – (каля 20); гісторыяй і сучасным станам асобных відаў дакументаў – (25), іншымі праблемамі – звыш 20.

Тэарэтычнаму даследаванню паняцця "беларуская кніга" прысвечаны артыкулы В. Е. Лявончыкава, І. У. Дрыгі, Л. А. Дзямешкі. Прааналізаваўшы розныя падыходы, аўтары прыйшлі да высновы, што толькі на падставе спалучэння, камбінацыі розных прымет магчыма даць азначэнне і вызначыць аб'ём паняцця "беларуская кніга". Вывучэнню тэрміналагічнай сістэмы кнігазнаўства прысвечаны таксама працы Л. І. Доўнар (кнігадрукаванне і кнігавыданне), Т. А. Самайлюк (рэлігійная кніга), а таксама тэрміны знайшлі адлюстраванне ў "Тлумачальным слоўніку бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў", які падрыхтаваны В.Е. Лявончыкавым, Л. А. Дзямешкай, Р. І. Саматыя [4]. Паспяховы вынік любога прыкладнога кнігазнаўчага даследавання будзе залежаць ад вырашэння пытанняў тыпалагізацыі кнігі. У розныя гады даследаванням гэтага тэарэтычнага кірунку кнігазнаўства былі прысвечаны навуковыя працы І. У. Мельнік (на прыкладзе кнігазнаўчых выданняў), Р. А. Ровінай (на прыкладзе тэхнічнай кнігі), А. І. Саломка (на прыкладзе грамадска-палітычнай кнігі), Т. А. Самайлюк (на прыкладзе рэлігійнай кнігі), В. А. Касап (з агульных пазіцый стандартызацыі кнігі) і іншых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крыніцазнаўчым аспектам былі прысвечаны артыкулы Я. С. Умецкай і А. П. Грыцкевіча. У іх раскрывалася кола гістарычных, архіўных, літаратурных крыніц для вывучэння гісторыі кнігі Беларусі розных перыядаў (феадалізму і капіталізму). Даследаванню гістарыяграфіі кнігазнаўства прысвяціла сваю працу Л. І. Доўнар. Яна асэнсоўвае асаблівасці развіцця беларускай навукі пра кнігу ў 1920-я гады, адзначаючы здабыткі і хібы. У навуковай працы вывучаецца роля В. Ластоўскага, А. Шлюбскага, Я. Карскага, В. Эпімах-Шыпілы ў гісторыі беларускага кнігазнаўства.

Сур'ёзную ўвагу даследчыкі універсітэта надаюць вывучэнню гісторыі беларускай кнігі, уводзячы ў навуковае абарачэнне новыя гістарычныя факты. Так, у першай працы па праблемах кнігазнаўства, падрыхтаванай Я. С. Умецкай у 1972 г., устаноўлены факт і час выдання першага беларускага часопіса. Даследаванні Л. І. Доўнар, А. П. Грыцкевіча, В. М. Бігезы, Я. С. Умецкай, Т. А. Самайлюк і іншых навукоўцаў тычацца розных аспектаў гісторыі кнігі (яе перыядызацыі, асаблівасце падрыхтоўкі і распаўсюджвання, кнігадрукавання на пэўнай тэрыторыі, раскрыцця зместу і адметнасцей пэўных помнікаў кніжнай культуры і іншых). Неабходна адзначыць факт падрыхтоўкі першай манаграфіі Т. А. Самайлюк "Православная книга в Беларуси", якая была выдадзена ў 2005 г. [5]. Навуковыя даследаванні ў галіне гісторыі кнігі за перыяд з 1917 да 1991 г. вызначаюцца разнастайнасцю тэматыкі, звязанай з вывучэннем яе відавага складу, чытацкага адрасу, галіновай прыналежнасці. Так, пачынаючы ад 1970-х гадоў паслядоўна вывучаліся гісторыя развіцця тэхнічнай кнігі (Р.А. Ровіна), грамадска-палітычнай кнігі (А. І. Саломка, С. А. Паўлава, Т. В. Кузьмініч), кнігі па мастацтве (Э. С. Суддзя, І. У. Дрыга). Акрамя таго, даследчыкі звярталі ўвагу на вызначэнне асаблівасцей кнігі пэўнага чытацкага адрасу, напрыклад, В. М. Бігеза даследавала адметнасці развіцця дзіцячай кнігі, З. М. Клецкая – асаблівасці падрыхтоўкі і чытання кнігі рабочымі аўтарамі. Глыбока вывучаліся таксама відавы склад і асобныя жанры кнігі: перыядычныя выданні, лістоўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (С.А. Паўлава), мемуарная літаратура (А. І. Саломка). У большасці кнігазнаўчых даследаванняў таго перыяду ў падмурак былі пакладзены статыстычны і зместавы метад аналізу патоку выданняў.

Сучасныя кірункі кнігазнаўчых даследаванняў ва універсітэце развіваюцца пад уплывам сусветных тэндэнцый паглыблення

фундаментальнасці даследаванняў з аднаго боку і пашырэннем міжгаліновага складніка – з іншага. Для іх характэрна пашырэнне тэматычнага кола даследаваных праблем (мастацтва кнігі, культура кнігі), узмацненне філасофскіх абагульненняў у сферы фенаменалогіі кнігі. Паралельна развіваюцца інфармацыйная і дакументазнаўчая парадыгмы кнігазнаўства, але ўсе большую ролю пачынае адыграваць і культуралагічны падыход. Узмацняецца і метадалагічная база даследаванняў, усё шырэй выкарыстоўваюцца бібліяметрычны, структурна-тыпалагічны, сістэмны і іншыя метады для вывучэння кнігі, кніжнай прадукцыі мінулага і сучаснасці. Тэматыка кнігазнаўчых даследаванняў нашага часу звязана з вывучэннем сучаснага рэпертуару кніжнай прадукцыі ва ўмовах рынкавых адносін, даследаваннем галіновых патокаў дакументаў, выдавецкай дзейнасці на Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды, даследчыкі пачалі звяртацца і да аналізу выдавецкай прадукцыі беларускага замежжа, новых з'яў у кніжнай справе – стварэння і выкарыстання электроннай кнігі. З пазіцый шырокай трактоўкі навукі пра кнігу даследуюцца і такія праблемы, як кнігараспаўсюджванне праз розныя каналы кніжнай камунікацыйнай сістэмы, камплектаванне бібліятэк рознымі відамі літаратуры, асаблівасці чытання і іншыя. З 2006 г. у межах запланаванай тэмы НДР вывучаюцца дакументныя камунікацыі бібліятэк, асновай якіх з'яўляецца камунікацыйная прырода кнігі.

На сённяшні дзень бачна, што перспектывы кнігазнаўчых даследаванняў ва універсітэце ляжаць у кірунку пашырэння даследавання метадалагічных праблем, навуковага аналізу месца кнігі ў сучасных інфармацыйных камунікацыях, дэталёвага вывучэння асобных відаў і форм кнігі, іх тыпалогіі. Не абміне навукоўцаў і вывучэнне гісторыі кнігі на розных этапах яе развіцця. Безумоўна, праблема культуры кнігі ў агульным кантэксце вывучэння беларускай культуры, фарміравання культуры яе афармлення і выкарыстання будуць па-ранейшаму надзённымі. Для больш паспяховага аналізу актуальных кнігазнаўчых праблем неабходна стварэнне рубрыкатара перспектыўнай кнігазнаўчай тэматыкі, прыцягненне маладых даследчыкаў, стварэнне каардынацыйнага цэнтра кнігазнаўчых даследаванняў у краіне.

**Заўвагі**

1. Працы выкладчыкаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры (1944–1994 гг.) : бібліягр. паказальнік / БУК ; склад.: Т.А. Самайлюк, І.П. Кажура, А.І. Саломка, Т.А. Дзем'яновіч. – Мінск, 1994. – 131 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Працы выкладчыкаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў (1994–2000) : бібліягр. паказальнік / БДУ культуры і мастацтваў ; склад.: Л.І. Доўнар, І.Н. Кажура, Т.А. Самайлюк, А.І. Фядорына, Т.А. Дзем'яновіч. – Мінск, 2005. – 136 с.

3. "Кніжніца" Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : у 2 ч. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Дзем'яновіч Т.А., Доўнар Л.І., Самайлюк Т.А. – Мінск, 2006. – Ч. 1. – С. 5–11.

4. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / склад.: В.Е. Лявончыкаў, Л.А. Дзямешка, Р.І. Саматыя. – Мінск : Вышэйшая школа, 2003. – 202 с.

5. Самойлюк, Т.А. Православная книга в Беларуси / Т.А. Самойлюк. – Минск : Православное Братство в честь Святого Архистратига Михаила в г. Минске, 2005. – 127 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# НАЦИОНАЛЬНАЯ КНИЖНАЯ ПАЛАТА БЕЛАРУСИ КАК ИНФОРМАЦИОННО-РЕСУРСНАЯ БАЗА КНИГОВЕДЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ

***Елена Витальевна Иванова,*** *директор Национальной книжной палаты Беларуси*

Национальная книжная палата Беларуси была образована в 1922 г. в структуре Государственной и университетской библиотек как отдел – Белорусская книжная палата. На этапе становления функции Книжной палаты заключались в получении, регистрации и распределении обязательного бесплатного экземпляра (ОБЭ) печатных изданий. В 1977 г. Книжная палата передана в подчинение Государственного комитета по делам издательств, полиграфии, книжной торговли. С тех пор сферы ее деятельности значительно расширились, и сегодня Книжная палата, действительно, уникальная структура: она выполняет библиотечные функции, является архивным учреждением, организацией по статистике и стандартизации, активно занимается издательской деятельностью, разрабатывает информационные технологии в области печати. Но все эти направления деятельности связаны между собой общими целями: сохранение книжного наследия Беларуси и белорусского народа, а также содействие развитию книжного дела и книговедческой науки.